ГОД I. **Цана асобнага нумэру 5 кап. (10 грошэй).**

№ 6.

НАША ДОЛЯ

ВИЛЬНЯ, **1 дзекабра** **1906 г.**

першая беларуская газета для весковаго и местоваго рабочаго народа.

выходзиць раз у тыдзень русскими и польскими литэрами

Адрэс редакции и администрации: **ВИЛЬНЯ, КАТЭДРАЛЬНЫ ПЛАЦЪ № 4.**

Тэлефон Рэдакции и Канторы № 591.

Цана: з пересылкаю и дастаукаю да хаты: на 1 год—**3 руб**, на 6 месяцоу—**1 руб. 50 кап.**, на 3 мѣс.—**75 кап.**, на 1 мес.—**25 кап.** Без дастауки и пересылки: на 1 мес.—**2 р. 40 к.**, на 6 мес.—**1 р. 20 к.**, на 3 мес.—**60 к.**, на 1 мес.—**20 к.** За границою: на **1** год—**4 р.**, на 6 мес.—**2 р.**, на 3 мес.—**1 р.** Перамена адрэсу—**20 кап.**

АБЪЯУЛЕННЯ прыймаюцца на наследняй страницы **па 20 кап.** за линейку пэтиту.

Руканисы и карэспандэнции, присыланыя у Рэдакцию мусяць быць чытэльна написаны з фамилею и адрэсомъ таго, хто их присылае. Адрэсъ толки для вадама Редакции.

Голад.

Кали вайна у краю кипела
И кроу лилася, як вада,—
З крави зямля пачырвенела
И з кожным днем расла бяда...

Кали звяроу — людзей таукали
На мирных жыцелеу каб биць...
Кали дзяцей не шкадавали
У вачах прад матками рубиць...

Тагды ускипела неба гневам
И голад страшны зтуль ступиу
И скрыдлы над зямли пасевам
Як цар-арол ён расхилиу.

И пахмурнели у смутку нивы,
И пажауцела уся зямля,
Маркотны, смутны, моучаливы
Прад смерцяй были усе паля.

Ламалась рож, каласы пали,
И сонцэ огненае жгло,
И росы ниу не асвяжали,
Зачахла усе и умярло.

Салому уместа хлеба ели
(Бо скот дауно ужо падох)
И пухли людзи и чарнели,
Ядучы зельска, кору, мох...

Дзярэуни хутка вымирали,
Хвароба йшла, нибы пажар,
И крыки неба разрывали...
Но бэз литосци голад-цар.

. . . .

Тагды вайна у краю кипела
И кроу лилася як вода...
З крави зямля пачырвенела
И з кожным днем расла бяда...

. . . .

Тагды у палацах што? — гуляли,
Начами ели ды пили,
И Бога — голад выхваляли
Што крыки бедных замярли.

. . . .
. . . .
. . . .
. . . .

И. Изгур.

ЯКАЯ БУДЗЕ ДУМА?

Ня доуга свецила сонца свабоды над абяздоляным руским гасударствам.

Згусцилися чорныя хмары. Завалаклося ими неба а з грязныхъ нораў выпаузли, баючыся свету, брыдкия гады.

Цяпер яны горда падняли голавы. Цяпер яны пачули свою силу, кали жменя гныбицялёў, маючы камандзера у Сталыпини, заливаець кроую усе агромна гасударства, хачучы патапиць у крави вялики асвабадзицяльны рух. З радасьцяю прыслухиваюцца яны да залпаў, ад каторых гинуць сотни сыноу свабоды, з уцехаю даведаваюцца аб частых смяртэльных прыгаварах ваенна-палявых судоу--гэтай насмешки над правасудзем.

Имя успомняных выжай гадау — ёсць: „исцина рускіе людзи". Гэта тые самые людзи, што у минуушу восень спрауляли морды на усем рускам гасударстви, што абхляпали кроую вулицы Беластока и Седлеца.

Их ёсьцяка мало, но яны сильные. Моцные яны тым, што за ими стаиць правительства з многими тысячами штыкоу.

У заузятасци сваём яны (гады гэтыя) грозяць нават сваим-жэ прыяцелям, бюракратам, усялякими страхами-кали тольки жыдам будуць даны роуные права з другими. Яны самым грубым спосабам вымагаюць ад прадставицяляу министэрства каб было робляна паихняму и министэрства гэта, министэрства Сталыпина, боязливое, слухаець их таму, што видзиць у их падпору для падгниушаго самауласцься.

Цяпер усе старання гэтых людзей скерованы, каб якколькьвек у Гасударствяну Думу выбраць сваих кандыдатау.

Правицельства надта памагаець им у гэтум, каб у Думу пралезла як найбольш „чорнай сотни" дзеля гэтаго яно адабрало права выбарау бэззямельным мужыкам и многим, многим тысячам рабочаго люду словам—тым хто боляй усих маець права быць нязадавольненым сягоднашним парадкам яно (правицяльство) думаець, што таким спосабам удасцца выбраць у Думу многа, кали и не чорнасоценнцау, то напэуна ужо людзей ня смѣлых, людзей — каторых можна збароць.

Але чы часами не намылицца яно? Таж апрыч работникау ёсць ня мала и других незадаволяных. Бо и дапрауды--хто жэ пазволиць як ня „исцинна руские людзи" гэтыя—забуйства граждан, што у нас штось дзень адбываюцца назваемые „казнями". Камуж у спадоби бязмерна зладзейства бюракратау - примерам—кража генер. Гурко.

Справы граждан усяго рускаго гасударства, за выключенем чиноуникау, багачей и „чорнай сотни"—цяпер адныя. Цяпер усе хочуць тольки аднаго — дабицца настаяшчай гражданскай свабоды, настаяшчаго парлямэнту. Каб жэ гэтаго дабицца треба исци рука у руку — паробкави з гаспадаром, рабочаму з дробным уладзельцам и майстрам. И тольки тагды, як будзець вымажана ад правицяльства праудзива палитычна свабада тольки тагды рабочы народ магчыме исци своеи асобнай дарогай.

Мы верым цвёрда, што дробные землеуладзельцы кали и ня будуць падавать галасоу за кандыдатау рабочых, то усеж таки вибяруць людзей, што ганяцьциперашняе правицяльства.

Не! надзея „чорнай сотни" быць бы браными да Думы—ня велика.

Граждане Рускаго Гасударства з гневам адсунуцца ад шайки разбойникау, памагаюшчых катам и казнакрадам. Не памогуць и штыки, што их падтрымывали да гэтуль у пагромах и мордах людзей—цепер яны будуць для их бэз карысци.

Штыками ня можна прымусиць чалавека думаць иначай як ён думае—и. паутараю яшчэ раз, и штыки нават не памогуць „чорнай сотни" быць выбраными депутатами у Гасударствяну Думу.

ГОЛАД.

Страшна робицца пры гэтым слови. Валасы паднимаюцца на галаве и мароз перабегаець на скуры.

Галадаюць дзесятки и сотни вёсак, галадаюць цэлые паветы и нават цэлые губэрни.

У татарскай весцы Тетюшскаго павету Казанскай губ., пишуць газэты, бацьки прадавали сваих дочак гэтак ад 12 да 17 гадау—прадавали их на распусту за 100-

150 рублоу — кожну. Прычына такаго страшнаго праступку быу голад, — голад, ад катораго гинули цяжкаю, страшнаю смерцяй.

Таки голад, як пишуць газэты, ящэ николи ня быу у Расеи. Падумайце тольки: **з аугуста месяца гэтаго году мужыки у ва многих мяецох ядуць чэраз дзень, други а то й трэци.**

Каб меньш хацелася есци, няшчасные кладуцца и ня рухаюцца, бо ведама што як чалавек спакойна ляжыць—дык меньш есци хочэ. Каб як выкармиць скацину здзирали стрэхи з хатау—але ничога не памагло—паздыхала.

Уместа хлеба людзи мусяць есци мякину, жолудзи, церту кару, листы, мох.

Палаженне галодных страшна. Ляжаць яны покатам, плачуць и стогнуць; — паглядзець на их — скура ды косци. Потым начынаюць пухнуць. Усе цела разраниваецца и урэшци чалавек гине у найстрашнейшым кананю. Пухнуць сотни и тысячы красцьян. А тут яшчэ падходзиць зима. Холад и голад злучацца, каб разам губиць нашых братоу. А помашчы нескуль ждаць. Бюракрація напишэць цыркуляр и думаець што ужо заткнула галодны рот. А каль и захоча памагчы памираюшчым ад голаду людзям, та паручае гэту справу такому Гурко, каторы, напрыклад, аддау якомусць заграничнаму махляру Лидвалю (1.300.000) мильен трыста тысячоу рублоу — а гэты схавау их сабе у кишэнь.

Церпяшчаго голад на 1 руб. 50 к можна пракармиць цэлы месяцъ (пакуль прыдуць лепшые часы) дык на 1300000 р. на гэтыя грошы сабраныя ад мужыкоу таким парадкам можна былоб пракармиць 850.000 васямсот пядзесят тысячоу чалавек у месяць! А гдзе цяпер грошы тыя? — гдзе крывава мужыцкая праца? Каб аддаць падатки мужыки прадавали быдла, палатно —што тольки мели — каб тольки напхаць горла казне, а самы цяпер пухнуць з голаду.

Вот часы настали!... А казна гэта, замест памачы няшчасным высылаець грошы за границу—Лидвалям и таким парадкам даець яшчэ большы прастор голоду, хвароби и смерци.

Чарвоны.

ПАПРАУКА.

У № 5 „Нашае Доли“ у артыкуле моим „Дэпутаты ад Вильни“ уместа „**п. Гуща**“ трэба чытаць „п. Коньча“. Вельми перэпрошаю п. Гущу за маю памылку.

Адам.

Як Виленские рабочые ваявали з злучыушымися капиталистами.

Кожны человек па асобни — слабы и яго усяки можэ крыудзиць. Кали людзи злучаны — та яны сильные. „У громадзи сила“ гэта усе знаюць. Асобна кожны рабочы не палепшыць сваяе доли, а кали усе рабочые разам возмуцца, та дабьюцца таго, што будуць меньш працаваць, а больш зарабляць, свабодным часам будуць магли пачытаць ксёнжку, даведацца, што робицца на свеци — словам будуць жыци як чалавек, а не як скацина.

Усюды работники добра гэта знаюць и пазлучалися у таварыства и суполки (саюзы).

Усе шауцы злучаюцца у адзин саюз, усе крауцы у други, усе сталяры у трэци и т. д. Так сама и у Вильни близка таго увесь працавиты народ злучыуся у свао саюзы. Каб дабицца лепшых варункоу жыцця работники маюць найлепшую помачь для сабе: гэта забастаука.

Зробяць забастауку, ня пойдуць рабиць, и запатрабуюць ад сваих паноу большай платы, а меньш работы. Другие рабочые на их месца ня пойдуць бо усе яны жывуць у згодзи, заступаюцца одны за других. Калиж знайдуцца такіе, што згодзяцца пайсци на месца забастоушчыкау, та их прагануць. Як забастоука, — дык фабрыки чы заводы стаяць гаспадары их не зарабляюць (а грошы страх як любяць) та и згодзяцца: няхай работники зарабляюць, и мы, хаця и меньш, але усеж будзямо грошы складаць.

Дабьюцца рабочые лепшых варункау, пройдзе неяки час и зноу зробяць забастоуку, пакуль не дабьюцца такого палаження, якое для их ёсць канешным. У

гэтай барбе правицельства памагаець багатым, садзяць работникау „падстрекацелей“ у турмы. Але рабочые не баяцца гэтаго — и з кожным годам, нават з кожным месяцам, кали яны тольки змовиушися, палаженне ихня палепшаецца.

Бачучы гэта фабриканты, купцы, заводчыки, адным словам капиталисты пашли да галавы па розум. Будзямо, кажуць, и мы злучацца,—тагды не пабаимся забастовак. Так и зрабили.

Кали у адной фабрыцы канвертау рабочые зрабили забастауку, дык усе фабрыканты конвертау злучылися у суполку, — прагнали рабочых, думаючы сабе: як выгаладзяцца, дык прыдуць и будуц рабиць за сколька мы захочам.

У фабриканта кяшэнь набита туга—галаду яму баяцца не трэба... чы няправуда?...

Такая суполка фабрыкантау завецца **локаут**.

Як началася у Вильни забастоука панчошниц—усе фабрыканты панчохау абъявили локаут. А што рабили рабочые? Чы спалохалися мо? Паляцели на работу? Отаж не! Яны сабе баставали и даляй. Мы ужо успамянули, што рабочы люд жывець з сабою дружна — адзин за усих и усе за аднаго. И цяпер, кали 1500 и больш снавали па Вильню бэз работы — другие памагли им.

Пяраплётчыки, цыгарники, булачники, загатоушчыки, пальчатники, шауцы, крауцы, слясары, сталяры и другие—усе злучанные у саюзы, збиралися, радзилися як памагчы забастоушчыкам. На ззабраньнях гэтых пастанавили, каб кожны рабочы што месяц аддавау на забастоушчыкау свой заробак з 2 днёу. Зрабилася камисия для вайны з гэтыми **локаутами**.

Збиралися грошы, нашлася каса, у каторай цяраз 2 месяцы набралася 1735 руб. 76 к. Гэтыя грошы выдавалися па троху забастоушчыкам, каб яны не галадали. Забастоука цягнулася 11 нядзель. Багачы што гэтаму николи канца ня будзе и што яны могуць саусим згалець, капиталисты начали пярагаворы, а патым згадзилися даць, чаго рабочые хацели, нават яшчэ заплацили и за час забастоуки.

Таким парадкам локаут быу зломаны и працавиты люд цешыусе з выгранай. А выграна гэта была ня малая. Кабы выграли капиталисты дык и другіе багачы рабилиб такие **локауты** — а цяпер усе яны пазнали, што ничога ня зробяць проциу злучыушагося люду—сокам и кроую каторага нибы пияуки — усе яны жывуць. Гэты выпадак вилянских локаутау лишни раз паказвае тольки, што

у злученю сила!

Янук з за печки.

ПАН и МУЖЫК.

(З Крашэускаго).

Иду раз сабе пяхатою.
На вулицы-ж вельми балота;
Аж чую, хтосць едзець за мною...
Атож з панами бядота!..
Зиркнуу назад, дый у ноги,
Бо пан мой—мог мине здратавать;
У тым чую: „пачэкай, мой дроги!“
Каль кличэ та трэба чакаць.
И шапку зняушы я стау...
. . . .
Дождж лье, я жду, аж от
Ляциць и—„як ся маеш?“ сказау,
И згинуу, як вихар, як чорт.
И тольки балотам усяго абхлапау.
З панами такая та справа
Што каль ня задратуе,
(Падчас яму и гэта забава!)
Калу-ж—никали не пашкадуе!

Будзицель.

Ахфяры.

Людзи бунтуюцца... бунтуецца многа... тысячи, дзесятки тысячоу, а гляньце скольких судзяць?!.. Прад несправядливым людзким судом сядзяць на лауцы двое, трое... гэта значыць: яны винаваты, бо яны неякосць забадзялися памеж тых многих што бунтуюцца... Чы виноуные, чы не — яны мушуць адвечиць — часами и надта цяжка... Хтосьци сказау:

„Прыстава падстрелили“ цап бунтаушчыка и узяли: як ен асмелиуся галасно гэтакъ сказаць?!..

Други пашкадавау прияцеселёу народу и — спаткауся разам з першым перад судом...

Чи гэта вяликия бунтаущыки, праступники?

Не—гэта—бедныя, няшчасныя ахфяры....

З Сыбиры варочаушыйся да хаты полк, дачууся, што яго хочуць пасладь на усмиренне.

Салдаты загаварыли... загаварыли намеж сабою аб тым—што во як дзякуюць им — за кроу их пралиту на вайне...— пасылаюць их „усмирадь“, зноу бидь, але не ворогоу, а родныхъ братоу...

И салдаты загаварыли...—не хацели исци на гэтаки страшны грэхъ...

Полк акружили —палкоуник паказау на трох чатырох якабы бунтаущыкоу—и их арэштавали.

И от яны ужо пред судом... — хаця и сами ня ведаюць як и за што сюды папали. Сядзяць...

А их судзиць страшны — няспраўядливы суд... и асудзиць—можа на смерць...

А людзи маучаць — хаця над галавами усих нясецца вялики балючы стон...

Ахфяры, ахфяры!...

С. В.

АЙЧЫЗНА У ЦЬМЕ.

Апусцилася глухая
Ноч над роднай стараной.
И зноу лиуни не сцихая
Льюцца цёнгля над зямлей.

Цёмны, велькия зноу хмары
Усё неба заняли...
Нудны, восени дни шары
Замест лета нам прышли.

Плачець вецер над прасторам
У барах и на палях
Плачець, стогнець слезным хорам
Жыцце у муках и болях.

Нянагода гэта, слякаць
Жыцця стоны глушаць усе
И з натураю паклякаць
Нибы страшна смерць идзе.

И бушуець громка бура...
У нашай беднай старане.
Хмары звислися панура...
Циснуць грудзь радной зямле.

И. Изгур.

З Беларуси и Литвы.

Вильня. 22 наябра у Виленскай Судзебнай Палаце разглядали справу рэдактара польскай газэты „Echo“, Уладзимира Стойкава за выдрукаванне у нумэру 11 гэтай газэты артыкула „што трэба и чэго ня трэба чытаць“. Прэдседау тайны саветник санатар Карнович. Абвиняу таварышч пракурора палаты Замыслоуски. Бараниу справу прысяжны паверены Т. Врублеуски.—Палата пастанавила: газэту „Echo“ замкнуць на усягды, а рэдактора пасадиць у крэпасць на 3 месяцы.

У прошлым тыдню зноу канфискавали № 5 „Нашае Доли.“

Гродня. Списки избирацелёу ужо зроблены. З памеж избирацелёу больш жыдоу. Глауны рэй вядзе прашлагодни камитэт. Кандыдата у Гасударственую Думу ужо выставили.

Вицебск. У гэтым часи, як нам вядома, кончылися прадвыбарные зъѣзды мужыкоу у Вицебскай губэрни. З зэтых зъѣздау видаць, што яны ужо добра зарганизаваны и ведаюць як и што рабиць кали прыдуць выбары, каб выбрадь дэпутата не ад правицельства а ад мужыкоу.

Гарадэк (Вицебскай губ.). У гэтым гаду прадвыбарная работа идзе иначэй як у прошлам Ка-дэты, што раней надта ужо многа нашумели, цяпер прыцихли саусим. Але за тое надтаж стараецца ужо чорна сотня. Яна нават хочэ каб у Гасударсцвеную Думу выбраць тольки аднаго пасла, а то як пасладь двух, дык барани Божэ памеж них пойдзе разлад. Руских выбаршчыкау больш як жыдоуских.

Невель (Вицеб. губ.). Тутака прыгатауляюцца да выбарау някосць циха. Людзи мала спадзеваюцца дабра ад новай Думы. Тамтэйшые таварыства и суполки так як и ня прыгатаулялися да выбарау.

Раскиданы тольки писульки Вицебскаго фэдэрацыунаго (союзнаго) камитэта „бунда“ и р. с.-д. р. п.

Пецярбург. У гэтых днях працуу хаты № 95—Вяземскай лауры, хтосци выстралиу и смертэльна рану памошчника пристава трецяго участка Спаскай часци Шэрэметава.

— Шэрэметава недауня перевяли у Пецярбург з Беластока, гдзе, як людзи гаворуць, той самый Шэрэметау устроиу Беластоцки пагром.

Пецярбург. Газэта „Бир. Вѣд.“ пишэць аб адним выпадку, каторы дужа напаминаець дзела Гурко-Лидваля. Выпадкам гэтымъ ёсць надта хуткае палучення ($1^1/_2$) паутара мильена рублоу контрагантам ваеннаго и морскога министерству панам Гинсбургам.

Дзела у тым, што Гинсбург запатрэбавау (5) пяць мильенау рублоу але камися пад прадвадзицельствам п. Шванебаха запытала яго упярод, як ён распараджауся вяликими грашыма, што яму выдавалися падчас вайны з Японияй? На комисю гэту глянули крыва и знайшлася другая;—глауным у гэтай камиси быу ужо сэнатар Черевански. Ушчот 5 мильенау пану Гинсбургави зараз жэ выдана было ($1^1/_2$) паутара мильена рублоу... Не бывалы поспех!

А тым часам вадомо што каб пан Гинсбург дастау грошы як найхучэй, надта хацелася пэуным асобам.

Пецярбург. Таварыщам министра унутрених дзел п. Гурко было празначана на публичные работы для мужыкоу Саратаускай губ. (1600000 руб.) адзин мильен шесць сот тысячау рублёу. Пан Гурко надта налегау на тое каб было празначана столька а не меньш. Цяпер то выяснилася, што ани губэрнатар ани земства стольки ни трэбавали. Гурка записку з абъясненнем павинен прыслаць на следствяну камисию.

Яшчэ да перадачы дзела Гурко на следствяну камисию, пан А. Стахович выдрукавау у газэци „Рѣчь“ аткрытую пиcульку на имя Гурко. У гэтай писульцэ Стахович абъяуляець, што ён першы пачау обвиняць Гурко—дабауляе пры гэтом, што пан Гурко можа будзе смялейшым ад Дурнаво—каторы збаяуся аддаць яго (Стаховича) пад суд за „дзела аб аусе“.

З палучаных газэтау з Далекаго Усходу даведваемся, што дзеецца там штось нядобрае. У Владзивастоцкам гарнизони няспакой. Японцы, ломяць дагавор и украпляюць востраў Сахалин.... Слухи ходзяць уселяки. Гаворань што кроу можа нават зноу палицца.

У Казанскам павеце ад голаду памеж мужикоу начинаецца *галодны тыфус*.

„Каз. Веч.“ пишэць што адпущены хлеб ад казны для мужнкоу, каторы раздаюць *земские начальники* тож не надта каб много пападау да мужицких брухау а то и заусим туды не пападаець.

30 губэрни церпяць ад хлебнаго недарода. Правицельства каб памоч галодным пазычыло 55 мильенау ды яшчэ Гасударственная Дума на гэта дала 15 мильенау, а мужики памираюць ад голаду.

(Смол. Вѣст.)

У Цяцюшскам павеце у бедных, глухих татарскихъ вёсках недауна *бацьки прадали сваих дочек ад 12 да 17 лет.* Вартасьць кожнай дзяучины ад 100 да 150 рублёу. — *Прычынай такога безбожнага паступку быу голад, а за ним и галодна смерць.*

(Каз. веч.

У Уфимскай губ. *у Белебеєускам, Мэнзалинскам и Уримскам* паветах *пануець тыфус* Голад ужо з сенцябра. Башкиры дык ужо дауно *ядуць ня хлеб, а сурагат,* каторы пякуць з скоцкай пасыпки и каторы ня кожная навэтъ собака будзе есьци. А той хлеб едзяць нават и дзеци.

(Уф. В.

У Архангельскай губ. растрывонили нескальки тысяч рублеу тых грошэй, што были адпушчэны гасударсцвеным казначэйствам на тое, каб кармиць палитычных, высланых у тую губэрню. Для разведки аб гэтай справи паслали, усем знагаго бышаго губэрнатара Минскай губэрни Курлова.

Як уемирали у Лифляндзкай губерни можна видзець з таго, што ад 6 акцябра да 6 наябра па прыгавору ваенна-палевого суда **было разтрэляно чы павешано 49 чэлавек;** акрамя гэтаго **забитых**: тых, што прабавали уцёкаць — **17 чэлавек**, тых, што сапрацуулялись — **4 чэл.**, бэз паказания прычын— **40 чэл. нехоця убитых—2 чэл.** а разам усяго за адзин месяц забитых 112 чэл.

(Товарищ.)

Усяго па троху.

Министр унутрених дзел 13 ноябра разаслау генэрал-губэрнатарам ось якое распаражэнне:

Списки избирацелёу у Гасударственую Думу павинны быць надрукованы як можна прандзэй. Патрэбные на гэта грошы ужо адпущэны, толька не трэба быць разжутным и глядзець, каб зрабиць эканомию на „литэрах, паперу и формаце.“ Гэта значиць, што трэба браць паперъ горшый, ды глядзець, штоб яго як можна меньш вышла на тые списки. А каб на маленким паперку змясьцицъ вяликий списакъ, так трэба друкаваць маленкими литерами.

Ось яки эканомны министр унутрэних дзел...

Бяда тольки, што ня кожный аднастайне умее эканомиць: адзин дык аж на друкаванню списку избирацелёу эканомиць а другiй якъ выясьнилось, па (1,300,000) мильен кидае триста тысячоу рублеу.

Добра хоць тое, што яны у адным министэрстви: што тавариш министра унутрених дзел генэрал **Гурка** разтрывоницъ, дык яго начальник, министр унутрених дзел генэрал Сталыпин зъэканомиць...

А тож, барани Божэ, сабралось бы таких два, як генэрал **Гурка**, ды ящэ и разам, — можна было бы працасць...

Лидваль дык вядома цецыуся бы гэтаму, але усё гасударства бы плакала так, як цяпер плачуць, прадаючы сваих жонак и дзяцей за кавалак хлеба, галодные мужыки, для каторых **Лидваль** вязе хлеб...

* * *

— Цяперака усе больш и больш высветляецца, што першую Гасударственую Думу разагнали глаунае дзеля таго, што незахацела празначиць и аддаць 50 мильеноу у руки кабинэту на працавольствяну кампаню и што иначэ глауной прычынай роспуску Думы быу В. I. Гурко.

У няубауки будуць апубликованы надта интарэсные мацерьялы—каторы заусим высветлядь гэта дзела.

Гоп! Гоп! засьпяваубыб.

Гоп! гоп! засьпяваубыб...
Ой што, што, я таму даубыб
Хтоб зрабиу, каб я васола
Засьпявау: каб у вакола
Загрымели песьняй горы,
Зазванили звонам зоры,
Зашумели лесы цемны,
Задзындзэляли бяздомны
Птушачки... а рэчки, боры
Каб гукали, нибы уторы
А у тым звони, у тым спеви,
Песьни васолай цавеви,
Кали сьпявалаб уся натура:
Песьня людзкая—панура,
Песьня грозы и праклёнства
Злосьци, пекла, акруцьенства
Сцихлабыб... а уцишы той
Усеб прыслухались сьвятой
Песьни жыцця—бо прыроды,
Песьни шчасця—бо свабоды...
И забылисяб аб горы,
Бо па жицевым прасторы
Песьня велькаб праляцела
И пхнулаб людзей да дзела...
Эй!.. Эй!.. ня будзець николи
Песьни такой, бо у боли
Трудна на песьню здабыцца
Засьпявай—та аблицца
Треба горкими слязами.
И над нотай и слывами.
И нихто, ништо на свеци
Вяселля ня дасць паэци.
Пакуль боль нас, гора мучыць
Такой песьни хтож навучыць?!..

Будзицель.

Ад рэдакции.

Просим усих наших чытацелеу писаць аб усем, што дзеецца, аб крыудах сваих и радоьсцях, хто як умее.

Кали патрэбна будзе каму якая парада—пытайце—адкажемо.

Ведайце добра, што „Наша Доля“— газэта весковых людзеу.

Прысылаючы грошы трэба канешне адресаваць так: у рэдакцию „Нашае Доли“ Вильня, а не на имя быушаго стоража рэдакции Ефстафия Сымоновича, бо ён больш ня служиць и грошы присланые на его имя трэба пераадрэсаваць.

Выдауца ЯН ТУКЕРКЕС Редактор АДАМ ГЕДВИЛЛО.

Odbijano w drukarni A. G. Syrkina.